РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ

Ленінскі сцяг у моцных руках

Мы песню пра шчасце сваё ўсе пяем.
Мы Леніна імя калгасам даем,
Мы ленінскі вобраз у сэрцы нясем,
Мы шчырую памяць аб ім беражэм,

Наш родны мілейшы ацец,
Ты цемры сялянскай паскорыў канец,
Вяліхі і светлы найлепшы вучыцель,
Ад вечнага рабства і бед вызваліцель.

За летняе сонца яснейшы твой розум
У навуку шлях адкрыў нам шырокі,
І вочы навекі зд слёз асушыў,
Свабодай назаўжды й зямлёй надзяліў.

Вучэннем сваім ты сялянам памог,
Да шчасця адкрыў ты дарогу дарог,
За праўду наш бацька змагаўся ўвесь век,
Па ленінскім шляху ідзе чалавек.

Квітней-жа, краіна, як роза ў садах,
Бо ленінскі сцяг у моцных руках,
Бо Сталін наш родны вядзе па слядах,
Што Ленін пакінуў у справах, славах.

Запісана ў калгасе „Камінтэрн", Хойніцкага раёна.

ЖЫЦЦЁ СВАЁ ВЯДЗЕМ ПА ЗАВЕТАМ ЛЕНІНА...

(Частушкі)

Над зямлёй зара гарыць
Над усім народам,
Гэта Ленін, наш Ільіч
Даў людзям свабоду.

Мы разбілі ўсіх бандытаў,
Разграмілі на франтах,
Бо да гэтага нас клікаў
Смелы голас Ільіча.

Сталі весела мы жыць,
Ільіча благадарыць,
Нам свабоду, зямлю далі,
Каб мы ёю упраўлялі.

Куплю Леніна партрэт,
Залатую рамачку,—
Вывёў ён мяне на свет,
Цёмную сяляначку.

У куточку на сцяне
Вісіць Леніна партрэт,
Доўга, доўга я не верыў,
Як сказалі: яго нет.

Мы цяпер усе жывем
Шчасліва, упэўнена,
Бо жыццё сваё вядзем
Па заветах Леніна.

Помніць Леніна я буду,
Буду помніць і любіць,
Як настаўніка і друга,
У сэрцы беражна насіць.

Эх, каб Ленін мог сягоння
Паглядзець, як мы жывем,
Як з яго вучэннем верным
К жыццю новаму ідзем.

Запісана ў розных раёнах БССР.

РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ. ВЫДАННЕ ЦК КП(б)Б. № 2. СТУДЗЕНЬ 1939 г.
На вокладцы: В. І. Ленін і Н. К. Крупская сярод дзяцей. Малюнак А. Давыдавай з журнала „Юный художник"

На вдымку: В. І. Ленін, І. В. Сталін і К. Е. Варашылаў за картай.

З малюнка мастака Васільева
(Выдавецтва „Искусство")
Рэпрадукцыя (Фотахроніка ТАСС.)

НЯХАЙ ЖЫВЕ ЛЕНІНІЗМ!

15 год таму назад—21 студзеня 1924 года—перастала біцца палкае сэрца велізарнейшага генія чалавецтва—Владзіміра Ільіча Леніна.

Владзімір Ільіч з'яўляецца тварцом і арганізатарам партыі большэвікоў, натхніцелем і кіраўніком Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, арганізатарам першай у свеце соцыялістычнай дзяржавы, аснавальнікам Комуністычнага Інтэрнацыянала, найлюбімейшым другам і правадыром працоўных усяго свету.

Ленін памёр, але незабыўны вобраз правадыра, настаўніка і друга будзе жыць вечна ў сэрцах народаў Совецкага Саюза і прыгнечаных і эксплаатуемых усяго свету. Яго няма сярод нас, але яго ідэі і заветы неўміручы. Яны ажыццяўляліся, ажыццяўляюцца і будуць ажыццяўляцца.

Вялікі прадаўжальнік Леніна правадыр працоўных таварыш Сталін высока трымае ленінскі сцяг і нясе яго непахісна па шляху к вяршынам комунізма. Таварыш Сталін яшчэ цясней згуртаваў народ вакол комуністычнай партыі пад сцягам Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна.

У дні, калі ўсенародны смутак быў надзвычай вялікім, таварыш Сталін, выказваючы пачуцці і думкі ўсяго народа з трыбуны Другога З'езда Советаў (26 студзеня 1924 года), даў свяшчэнную сталінскую клятву неўміручаму Владзіміру Ільічу Леніну—трымаць высока і захоўваць у чыстаце вялікае званне члена партыі.

„Мы комуністы,—гаварыў таварыш Сталін у сваёй клятве,—людзі асобага складу. Мы скроены з асобага матэрыялу. Мы—тыя, якія састаўляюць армію вялікага пролетарскага стратэга, армію таварыша Леніна. Няма нічога вышэй, як чэсць належаць да гэтай арміі. Няма нічога вышэй, як званне члена партыі, аснавальнікам і кіраўніком якой з'яўляецца таварыш Ленін. Не ўсякаму дана быць членам такой партыі. Не ўсякаму дана вытрымаць нягоды і буры, звязаныя з членствам у такой партыі. Сыны рабочага класа, сыны нужды і барацьбы, сыны неймаверных нястач і гераічных намаганняў—вось хто, перш за ўсё, павінны быць членамі такой партыі. Вось чаму партыя ленінцаў, партыя комуністаў называецца разам з тым партыяй рабочага класа.

Уходзячы ад нас, таварыш Ленін завяшчаў нам трымаць высока і захоўваць у чыстаце вялікае званне члена партыі. Клянемся табе, таварыш Ленін, што мы з чэсцю выканаем гэту тваю запаведзь".

Змагаючыся цвёрда і непахісна за ленінскія заветы, наша комуністычная партыя большэвікоў пад геніяльнейшым кіраўніцтвам вялікага і муд-

рага правадыра таварыша Сталіна прывяла народ Совецкага Саюза да перамогі соцыялізма.

Таварыш Сталін, выконваючы клятву аб адзінстве нашай партыі, бязлітасна вядзе і мабілізоўвае партыю і народ на барацьбу з ворагамі партыі і соцыялізма. Партыя большэвікоў разграміла і знішчыла ўсіх тых, хто імкнуўся пахіснуць жалезнае адзінства і згуртаванасць нашай партыі.

Партыя большэвікоў ачышчаецца ад варожых і пераражэнчых элементаў. Яна выгнала з сваіх радоў прэзрэных наймітаў фашызма трацкісцка-бухарынскіх і буржуазна-нацыяналістычных здраднікаў, шпіёнаў і дыверсантаў. Партыя, пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна, ускрыла і знішчыла гэту кучку прэзрэных лакеяў фашызма.

Партыя большэвікоў цяпер, як ніколі, згуртавана вакол ЦК ВКП(б) і геніяльнейшага правадыра таварыша Сталіна.

Тады-ж, на II З'ездзе Советаў, таварыш Сталін даў клятву:

„Захоўваць і ўмацоўваць дыктатуру пролетарыята.

Умацоўваць усімі сіламі саюз рабочых і сялян.

Умацоўваць і пашыраць саюз рэспублік.

Умацоўваць і расшыраць саюз працоўных усяго свету—Комуністычны Інтэрнацыянал".

Вялікія сталінскія клятвы ажыццёўлены і праведзены ў жыццё.

Разбураная імперыялістычнай і грамадзянскай войнамі краіна Советаў зараз ператварылася пад мудрым кіраўніцтвам таварыша Сталіна ў квітнеючую краіну. Грандыёзны будынак соцыялізма ў адной шостай частцы свету высіцца, як маяк над усім светам.

Паспяховае правядзенне індустрыялізацыі і сцэльная калектывізацыя ў краіне, выкананне двух сталінскіх пяцігодак, ліквідацыя эксплаататарскіх класаў, знішчэнне беспрацоўя ператварылі нашу краіну ў багатую, культурную, перадавую і непераможную соцыялістычную дзяржаву.

Выраслі гіганты заводы, фабрыкі, якія ўзброены першакласнай тэхнікай. Змянілася аблічча вёскі і сялянства. Калгаснікі і калгасніцы будуюць сваё шчаслівае, багатае і культурнае жыццё ў буйных калгасных гаспадарках. Краіна Советаў ператварылася ў індустрыяльна-аграрную краіну, стала радзімай усіх працоўных.

Большэвіцкая партыя з гонарам выканала запаветы Леніна аб умацаванні і пашырэнні саюза працоўных. З кожным днём мацнее дружба народаў. Нацыянальныя рэспублікі, пры брацкай дапамозе вялікага рускага народа, з кожным днём усё больш умацоўваюцца і працвітаюць. Квітнее нацыянальная культура па форме, соцыялістычная па зместу.

Ярчайшым прыкладам росту рэспублік Саюза з'яўляецца Совецкая Соцыялістычная Беларусь. БССР, у мінулым поўкалонія царызма, цёмная і прыгнечаная ўскраіна Расіі цяпер з'яўляецца рэспублікай з магутнай прамысловасцю і буйнай сельскай гаспадаркай. Весела і радасна жыве народ Беларусі ў моцнай дружбе з народамі Саюза.

Запаветы Леніна і клятва таварыша Сталіна аб штодзённых клопатах і ўмацаванні нашай слаўнай Чырвонай Арміі поўнасцю ажыццёўлены. Свабодны совецкі народ і партыя Леніна—Сталіна любяць сваю Чырвоную Армію, клапоцяцца аб ёй і прыкладаюць усе свае сілы для ўмацавання яе магутнасці.

Верны вартавы нашых непрыступных соцыялістычных граніц—Чырвоная Армія, следуючы сваім баявым традыцыям, у апошніх баях з японскімі самураямі каля возера Хасан, яшчэ раз паказала сваю сілу і непераможнасць. Яна разграміла ўшчэнт гэтых захватчыкаў з лагера фашызма, каб ім і надалей не павадна было саваць сваё свіное рыла ў наш совецкі агарод.

Але і гэта баявая схватка была яшчэ толькі „кветкамі". „Ягадкі" нашай слаўнай і несакрушальнай сілы Чырвонай Арміі, пры ўсеагульнай падтрымцы ўсяго многамільённага совецкага народа, фашысцкія мракабесы адчуюць тады, калі яны яшчэ папрабуюць напасці на нашу свяшчэнную зямлю.

Перамога рабочых і сялян краіны соцыялізма палымнее маяком, асвятляючы шлях для барацьбы працоўных усяго свету за сваё вызваленне. Позіркі рабочых і ўсіх прыгнечаных капіталістычных краін звернуты на нас, на краіну Советаў, дзе свабодны народ жыве і будуе соцыялістычнае грамадства.

Арганізатары перамог соцыялізма—Ленін і Сталін—з першых дзён рэволюцыі паставілі адной з важнейшых задач—параўнаць правы жанчын нашай краіны з правамі мужчын, забяспечыць жанчынам неабходныя ўмовы для развіцця, як поўнапраўным грамадзянам.

Гэта задача поўнасцю выканана і замацавана залатымі словамі ў 122 артыкуле Сталінскай Канстытуцыі: „Жанчыне ў СССР прадастаўляюцца роўныя правы з мужчынай ва ўсіх галінах гаспадарчага, дзяржаўнага, культурнага і грамадска-палітычнага жыцця.

Магчымасць ажыццяўлення гэтых правоў жанчын забяспечваецца прадастаўленнем жанчыне роўнага з мужчынай права на працу, аплату працы, адпачынак, соцыяльнае страхаванне і асвету, дзяржаўнай аховай інтарэсаў маці і дзіцяці, прадастаўленнем жанчыне пры цяжарнасці водпускаў з захаваннем утрымання, шырокай сеткай радзільных дамоў, дзіцячых ясляў і садоў".

Незыблема праводзіцца гэты закон у жыццё. Жанчыны працуюць на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва. Іх дзеці вучацца бясплатна ў навучальных установах і школах. У дзіцячых садах, яслях яны акружаны бацькаўскімі клопатамі і ўвагай.

Жанчыны краіны соцыялізма да канца адданы справе Леніна—Сталіна. Лепшыя людзі краіны: Грызадубава, Осіпенка, Раскова, Вінаградавы, Дземчэнка і дзесяткі сотняў такіх, імёны якіх вядомы не толькі ў Совецкім Саюзе, але і за межамі яго, з'яўляюцца героямі, пакарыцелямі стыхіі і наватарамі стаханаўскіх метадаў работы.

У пятнаццатую гадавіну з дня смерці правадыра і любімейшага друга народа—Владзіміра Ільіча Леніна, жанчыны краіны Советаў яшчэ раз клянуцца быць вернымі да канца справе Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна.

НЯХАЙ ЖЫВЕ ВЯЛІКІ НЕПЕРАМОЖНЫ СЦЯГ МАРКСА—ЭНГЕЛЬСА—ЛЕНІНА—СТАЛІНА!



На здымку: В. І. Ленін і І. В. Сталін гутараць з чырвонагвардзейцамі ў Смольным. 1917 г. (Мастак П. Васільеў, акварэль). Рэпрадукцыя (Фотахроніка ТАСС)

ГОРНЫ АРОЛ

Упершыню я пазнаёміўся з Леніным у 1903 г. Праўда, гэта знаёмства было не асабістае, а завочнае, у парадку перапіскі. Але яно пакінула ва мне незгладжальнае ўражанне, якое не пакідала мяне за ўвесь час маёй работы ў партыі. Я знаходзіўся тады ў Сібіры, у ссылцы. Знаёмства з рэволюцыйнай дзейнасцю Леніна з канца 90-х гадоў і асабліва пасля 1901 года, пасля выдання „Искры", прывяло мяне да пераканання, што мы маем у асобе Леніна чалавека незвычайнага. Ён не быў тады ў маіх вачах простым кіраўніком партыі, ён быў яе фактычным тварцом, бо ён адзін разумеў унутраную сутнасць і неадкладныя патрэбы нашай партыі. Калі я параўноўваў яго з астатнімі кіраўнікамі нашай партыі, мне ўвесь час здавалася, што саратнікі Леніна—Плеханаў, Мартаў, Аксельрод і іншыя—стаяць ніжэй Леніна цэлай галавой, што Ленін у параўнанні з імі не проста адзін з кіраўнікоў, а кіраўнік вышэйшага тыпу, горны арол, які не ведае страху ў барацьбе і смела вядзе ўперад партыю па нязведаных шляхах рускага рэволюцыйнага руху. Гэтае ўражанне так глыбока запала мне ў душу, што я адчуў неабходнасць напісаць пра яго аднаму свайму блізкаму другу, які знаходзіўся тады ў эміграцыі, патрабуючы ад яго водзыву. Праз некалькі часу, будучы ужо ў ссылцы ў Сібіры,—гэта было ў канцы 1903 года,—я атрымаў захапляючы адказ ад майго друга і простае, але глыбока змястоўнае пісьмо Леніна, якога, як аказалася, пазнаёміў мой друг з маім пісьмом. Пісьмо Леніна было параўнаўча невялікае, але яно давала смелую, бясстрашную крытыку практыкі нашай партыі і надзвычай яснае і сціслае ізлажэнне ўсяго плана работы партыі на бліжэйшы перыяд. Толькі Ленін умеў пісаць пра самыя заблытаныя рэчы так проста і ясна, сціла і смела—калі кожная фраза не гаворыць, а страляе. Гэта простае і смелае пісямцо яшчэ больш умацавала мяне ў тым, што мы маем у асобе Леніна горнага арла нашай партыі. Не магу сабе дараваць, што гэтае пісьмо Леніна, як і многія іншыя пісьмы, па прывычцы старога падпольшчыка, я спаліў.

З гэтага часу пачалося маё знаёмства з Леніным.

З прамовы таварыша Сталіна на вечары крэмлёўскіх курсантаў 28 студзеня 1924 г.

20—1

Клаўдзія Амосаўна Абушэнка. Сакратар Менскага абкома КП(б)Б. Дэпутат Вярхоўнага Совета БССР.

Вера Філіпаўна Харланава. Сакратар Клімавіцкага РК КП(б)Б. Дэпутат Вярхоўнага Совета БССР.

Елена Кірылаўна Жур. Старшыня Пухавіцкага Райвыканкома. Дэпутат Вярхоўнага Совета БССР.

Ленінскае выхаванне

Работа сакратара РК КП(б)Б настолькі многагранная і цікавая, што выказаць усё ў адным артыкуле няма ніякай магчымасці. Мне хочацца толькі спыніцца на вельмі важнай галіне крапатлівай партыйнай работы. Гэта—пытанне ленінскага выхавання жаночых кадраў.

Асабіста мой жыццёвы шлях з'яўляецца таксама яркім прыкладам росту жанчыны ў нашай краіне. З радавой сялянкі, у рэзультаце выхавання і клопатаў партыі Леніна—Сталіна, я выраслa ў кіраўніка раённай партыйнай арганізацыі.

Да ўступлення ў партыю я была палітычна не развітай. Не было часу вучыцца. Працавала пастушкай, а ў вольны час пляла лапці, каб забяспечыць сям'ю на зіму абуткам.

З першых дзён уступлення ў кандыдаты партыі я пачала актыўна ўдзельнічаць у партыйным і грамадскім жыцці краіны. Партыя стала для мяне той вялікай школай і сям'ёй, у якой атрымоўваеш баявую большэвіцкую загартоўку.

Мая адданасць партыі, радзіме, народу, любімаму правадыру таварышу Сталіну, з'яўляецца падзякай вялікай партыі за яе клопаты. Будучы яшчэ кандыдатам партыі, была накіравана партыйнай арганізацыяй на вучобу ў Магілёўскую партыйную школу. Атрыманыя веды ў школе, а потым у Комвузе надалі энергіі і энтузіязму для далейшых дзярзанняў, каб з яшчэ большым запалам апраўдаць вялікае званне члена КП(б)Б.

Вось ужо тры гады я працую ў Пухавіцкай партыйнай арганізацыі. Была загадчыкам партыйнага габінета, цяпер мне партыйная арганізацыя аказала давер'е, абраўшы другім сакратаром РК КП(б)Б.

У нас выраслі выдатныя жаночыя кадры на ўсіх участках соцыялістычнай гаспадаркі. Старшыня Райвыканкома тав. Жур—дэпутат Вярхоўнага Совета БССР, былая патомсцвенная батрачка. У яе могуць многія павучыцца, як трэба кіраваць, працаваць. Гэта жанчына вялікай сілы волі, настойлівая і патрабавальная, як да сябе так і да работнікаў совецкага апарата.

Не дрэнна працуе загадчыкам райздрава тав. Варончык, нядаўна вылучаная на гэту работу. Яна была радавой калгасніцай, потым старшынёй калгаса і, нарэшце, старшынёй Сенчанскага сельсовета.

Комуністкі, кандыдаты і члены партыі, з'яўляюцца на прадпрыемствах і ў калгасах раёна перадавымі людзьмі. Васіна—кандыдат партыі, работніца соўгаса „Індустрыя" працуе свінаркай. Яна стаханаўка. Дабілася надзвычайных поспехаў. За адзін толькі кастрычнік месяц 1938 г. зарабіла 1200 рублёў. Работніца картоннай фабрыкі імя Леніна Люба Атрошчанка, член партыі, стаханаўка, актыўная грамадчыца. Цялятніца калгаса „Звязда" Бесман Анця за час сваёй работы дабілася стопроцантнага захавання маладняка.

Большэвіцкія кадры раёна растуць таксама і за кошт беспартыйных з інтэлігенцыі. Дырэктарам аддзялення дзяржбанка працуе тав. Дубровенка. Яна добры кіраўнік. Упарта займаецца глыбокім вывучэннем гісторыі ВКП(б). Авалодвае тэорыяй марксізма-ленінізма. Рыхтуецца да ўступлення ў рады комуністычнай партыі большэвікоў.

У Прадзіцка-Слабодскай школе працуе настаўніца, энергічная комсамолка Марыя Екімовіч, яна выдатная грамадчыца, ініцыятар мастацкай самадзейнасці сельсовета, ударніца педагагічнай справы.

Аднак трэба сказаць, што мы не скарысталі ўсіх магчымасцей па выхаванню жаночых кадраў. У нас яшчэ недастаткова пярвічныя партарганізацыі ўцягваюць жанчын і нават комуністак у грамадскую работу. Вось, напрыклад, у партарганізацыі сельгастэхнікума комуністкі Валчок і Кузмітовіч не прымаюць удзелу у партыйным жыцці. Віна, безумоўна, тут парторга Вайцэхоўскага, які не цікавіцца работай і бытам гэтых таварышоў.

Неабходна добра арганізаваць работу па палітычнаму выхаванню жаночых кадраў.

Наша задача—растучых жанчын стаханавак, ударніц, лепшых грамадчыц вылучыць у кіраўніцтва калгасамі, фермамі, брыгадзірамі, у сельсоветы і раённыя ўстановы.

Рад жанчын з актыва і інтэлігенцыі прыступілі да вывучэння гісторыі ВКП(б). Наш абавязак штодзённа дапамагаць ім у авалоданні марксізмам-ленінізмам.

Ульяна Андрэеўна Лосенкова—сакратар Пухавіцкага РК КП(б)Б.

АВАЛОДВАЦЬ БОЛЬШЭВІЗМАМ

Я працую інспектарам райздрава. Мне неабходна быць палітычна падрыхтаванай. Для гэтага патрэбна вучыцца, упарта авалодваць большэвізмам—тэорыяй Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна.

Больш двух год я наведвала гурток палітвучобы, а карысці з гэтага было мала. На гуртку адседжвалі гадзіны, не вельмі клапоцячыся аб павышэнні свайго кругазору. Прапагандыст быў у нас мала падрыхтаваны.

Як толькі з'явіліся ў газетах першыя раздзелы кнігі „Кароткі курс гісторыі ВКП(б)" я зараз-жа пачала рэгулярна чытаць іх. Потым набыла падручнік і, не чакаючы асобных дырэктыў, пачала сур'ёзна і глыбока вывучаць яго. Я раней думала, што самастойна не магу працаваць. Калі-ж прапрацавала першы раздзел, то ўпэўнілася, што магу працаваць сама, што кніжка „Кароткі курс гісторыі ВКП(б)" напісана проста і зразумела.

Працую я такім метадам: чытаю кнігу, важнейшыя думкі падкрэсліваю, потым прачытваю адпаведны матэрыял класікаў марксізма—Леніна, Сталіна, сумірую і раблю канспект. Адначасова адзначаю тыя месцы, якія для мяне не зусім зразумелы, каб назаўтра запытацца ў сваіх таварышоў.

Я карыстаюся і дапаможнымі матэрыяламі, якія друкуюцца на старонках нашых цэнтральных рэспубліканскіх газет у „Дапамогу партвучобе". Апрача таго слухаю лекцыі ў партгабінеце. Прачытала такія матэрыялы як: „Богостроители", „Богоискатели", „Махаевщина" і брашуру Леніна—„Что такое „друзья народа" и как они воюют против социал-демократов".

Я свой час планую так, каб кожны дзень удзяліць не менш гадзіны на вывучэнне гісторыі партыі.

Варвара Лукінічна Навашынская.

Крычаў.

ПЕРШЫ ДЗЕНЬ УСЕСАЮЗНАГА ПЕРАПІСУ НАСЕЛЬНІЦТВА. 17 студзеня роўна ў 8 гадзін раніцы шчотчыкі прышлі на кватэру знатнага стаха аўца, токара менскага станкабудаўнічага завода ім. Кірава—Нікалая Васільевіча Лапіна. Нікалай Васільевіч Лапін мае 43-гадовы вытворчы стаж. На заводзе працуе ўжо 25 год. Сістэматычна выконвае нормы на 200 проц. Нікалай Васільевіч не раз прэміраван за сваю стаханаўскую работу. У дзень 20-годдзя БССР ён узнагароджан пачотнай граматай Вярхоўнага Совета БССР. НА ЗЛЫМКУ: перапіс у сям'і Нікалая Васільевіча Лапіна. Справа налева—Нікалай Васільевіч Лапін, яго жонка Марыя Сямёнаўна, сын-піонер Анатолій, вучань 6 класа 60-й школы, пляменнік Нікалай Владзіміравіч Мікульчык—комсамолец, мадэльшчык-стаханавец завода ім. Кірава і шчотчык—студэнтка 2-га курса Менскага педінстытута Васіленка.

Фота Л. Мазелева (Фотахроніка БЕЛТА).

У калгасе імя Леніна

Яе звычайна завуць Валяй. Гэта баявая, заўсёды вясёлая, жыццерадасная жанчына. Нават з першай сустрэчы з ёй хочацца загаварыць, расказаць аб усім і падрабязна. Мусіць таму з ёй так і дзеляцца калгаснікі, моладзь, старыя і дзеці. Часта бывае, што школьнікі спыняць Валю, раскажуць аб сваіх навінах, хто атрымаў „добра", а хто—„выдатна".

Валенціна Барысёнак яшчэ зусім маладая, але калгаснікі даручылі ёй кіраваць самай вялікай і асноўнай першай брыгадай калгаса. Як сапраўдны патрыёт сваей радзімы, аддана, з вялікай любоўю узялася тав. Барысёнак за даручаную справу. Яна цвёрда ведае, што поспех усёй гаспадарчай работы рашаюць людзі, народ. Яе задача арганізаваць добра работу. Вось з гэтага яна і пачала. Любое пытанне, якое датычыцца калгаснай гаспадаркі, жыцця калгаснікаў, яна вырашае разам з усімі членамі брыгады, з комсамольскай арганізацыяй.

Брыгада тав. Барысёнак з'яўляецца перадавой у калгасе. У спаборніцтве з другімі яна завявала пяршынства. З усімі сельска-гаспадарчымі работамі справілася ва ўказаны партыяй і ўрадам тэрмін.

У брыгадзе Валі дзяржаўны сортавыпрабавальны ўчастак. Ён займае 100 гектараў зямлі. Вылучаны лепшыя людзі з калгаснікаў на гэты ўчастак. Тры аграномы разам з усёй брыгадай другі год працуюць над тым, якія сарты зернавых культур (жыта, пшаніцы, аўса, ячменю) больш прымянімы на глебе Беларусі.

У калгасе імя Леніна сеюць выключна гатунковым насеннем. Пры захаванні і прымяненні ўсіх правіл агратэхнікі ён з года ў год дабіваецца ўсё большых і большых ураджаяў. Гэты буйнейшы калгас сельсовета славіцца сваімі высокімі сталінскімі ўраджаямі. У 1938 годзе кожны гектар зернавых даў 15—17 цэнтнераў, а на сортавыпрабавальным участку ад 16 да 28 цэнтнераў.

У 1937 годзе ў раён завезена новая культура—хмель. Калгас імя Леніна ў 1938 годзе зняў ужо другі ўраджай яго. Зараз калгас занесен кандыдатам на Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку.

Калгас імя Леніна аб'яднае 170 былых бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, за якімі навечна замацавана 1875 гектараў зямлі—пахаці, сенажаці і ўгоддзяў і 35 гектараў лесу. Мае 3 фермы, у малочна-таварнай налічваецца 225 галоў.

Шчасліва зажылі калгаснікі. Цяжкая, беспрасветная работа, калі жанчына аблівалася потам, гнучы спіну з сярпом у руках на паноў, канула ў вечнасць. Асноўныя работы ў калгасе выконваюцца машынамі. Акрамя машын МТС ёсць многа сваіх уласных.

Паравы рухавік з установкай лесапілкі і гонтарэзкі праз год абслужыць не толькі калгас імя Леніна, але і бліжэйшыя калгасы ваколіцы. Поўскладаная малацілка, дзве дзіскавыя, тры сашніковыя сеялкі таксама павялічваюць багацці калгаса. Драўляная барана, крывая сошка, якія бясконца мярэжылі вузкія сялянскія палоскі, беззваротна зніклі з бязмежных палёў.

Мы падлічылі багацці адной толькі сям'і Валасевіча Андрэя і Анеты. Яны атрымалі сёлета на працадні 3459 кілограмаў зернавых, 6918 кілограмаў бульбы, 2306 кілограмаў сена і саломы, 576 кілограмаў агародніны і каля 700 рублёў грашыма. А такая сям'я не адна. Не менш атрымала на працадні сям'я Гараўскага Івана і другія.

Знікла беднасць! Вялікая Кастрычніцкая рэволюцыя, калек-

Брыгадзір будаўнічай брыгады калгаса імя Гегечкоры (Зугдзідскі раён, Грузінскай ССР) І. К. Хазалія выпрацаваў у 1938 годзе 750 працадзён і атрымаў на іх 14 тысяч рублёў грашыма і многа прадуктаў.

НА ЗДЫМКУ: Тав. Хазалія за зборам лімонаў у сваім садзе. Злева яго жонка і дачка.

Фота Б. Сталярова (Фотахроніка ТАСС).

7-га студзеня ў Ленінградскай Дзяржаўнай філармоніі сіламі іспанскіх дзяцей—удзельнікаў гурткоў мастацкай самадзейнасці Ленінградскага палаца піонераў, быў дадзен канцэрт, які перадавалі па радыё ў рэспубліканскую Іспанію.

На здымку: Выступленне хора і аркестра.

Фота Р. Мазелева і І. Тюцікава (Фотахроніка ТАСС).

тывізацыя сельскай гаспадаркі, шырока расчысцілі шлях калгаснаму сялянству да свабоднага радаснага і заможнага жыцця. У калгасе выраслі новыя людзі—стаханаўцы. Вось, напрыклад, Тоня Галенчык. Ад звычайнай даяркі яна вырасла да брыгадзіра малочна-таварнай фермы.

На ферме 19 чалавек. З іх 15 жанчын-даярак, даглядчыц, цялятніц. Ужо некалькі год старшай цялятніцай працуе Анна Баркун. Сваёй клапатлівай, адданай работай яна поўнасцю захоўвае маладняк. У мінулым годзе без адзінага адыходу, яна вырасціла 70 здаровых цялят. Калгаснікі ганарацца адной з лепшых даярак Зосяй Шкор, ганарацца і лепшымі стаханаўкамі палявых брыгад Мар'яй Рыгораўнай Чумак і Анетай Валасевіч.

Вечарэла. Мы выйшлі з канцылярыі. Уздоўж вуліцы папарна і групамі ішла моладзь, пажылыя і сярэдніх гадоў калгаснікі. Старшыня калгаса тав. Шкор растлумачыў:

— У клуб збіраюцца. Вось так кожны вечар,—у нас там бібліятэка, а сёння яшчэ і заняткі гуртка па ППХА.

І моладзь, і пажылыя калгаснікі ўпарта авалодваюць ваеннай справай. Пры клубе акрамя гуртка па ППХА працуюць гурткі па вывучэнню і здачы норм на значок ГСА і ГПА.

Каля клуба пачулася песня,—цэлая група юнакоў і дзяўчат сваімі звонкімі бадзёрымі галасамі спявалі:

„Как невесту родину мы любим,
Бережем как ласковую мать".

І неслася ў шырокія калгасныя прасторы песня радасці, шчаслівага калгаснага жыцця, песня пра любоў да радзімы-маці, да нашай слаўнай комуністычнай партыі, да роднага і любімага Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

Старавойтава.

Менскі раён, Кайкаўскі сельсавет.

Член сельсовета

— Заўтра прэзідыум сельсовета! Трэба, як след, падрыхтавацца да яго. У позве напісана, што на прэзідыуме мая справаздача аб ходзе выканання дзяржаўных паставак і грашовых плацяжоў.

І вось тав. Бародзіч рашыла яшчэ раз праверыць на сваім участку, як абстаіць справа з выкананнем абавязацельстваў сялян перад дзяржавай і прыняць усе меры для ліквідацыі нядоімак. Зрабіла праверку. Выявілася, што былі яшчэ неплацельшчыкі. Бародзіч Марфа пагаварыла з кожным у паасобку, растлумачыла, што своечасовае выкананне дзяржаўных паставак і грашовых плацяжоў з'яўляецца грамадскім абавязкам кожнага селяніна. Ігнараваць гэта ні ў якім выпадку нельга. Агітацыйная работа дала свае рэзультаты. І за адзін дзень амаль усе разлічыліся з дзяржавай.

Марфа падвяла вынікі сваёй работы. І далажыла прэзідыуму сельсовета.

— Па майму ўчастку на 20 снежня 1938 года выканана натуральных і грашовых дзяржаўных паставак на 98 проц.— Два процанты недавыканання па прычыне выбыцця адной гаспадаркі з участка.

Зрабіўшы справаздачу, Марфа атрымала ад сельсовета падзяку за выдатную работу.

Яна заняла пяршынства па сельсовету па выкананню дзяржаўных заданняў.

Тав. Бародзіч працуе членам сельсовета тры гады. За ўмелую і добрасумленную работу яе ўсе паважаюць. У калгасе яна з'яўляецца лепшай стаханаўкай соцыялістычных палёў. За атрыманне высокага ўраджаю ільновалакна, 12 цэнтнераў і 10 цэнтнераў ільнонасення з гектара, яна залічана кандыдатам на ўсесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку. У гэтым годзе тав. Бародзіч абрана брыгадзірам. Брыгада яе таксама перадавая ў калгасе.

За ўзорнае і адданае выкананне ўсіх даручэнняў Лепельскі райвыканком два разы прэміраваў яе грашыма. І нарэшце самая высокая ўзнагарода для Бародзіч Марфы, гэта тое, што Ляхаўская пярвічная партарганізацыя прыняла яе ў групу спачуваючых.

Гатоўскі.

Лепельскі раён, калгас „Лутчына"

Уходзячы ад нас, таварыш Ленін завяшчаў нам трымаць высока і захоўваць у чыстаце вялікае званне члена партыі. Клянемся табе, таварыш Ленін, што мы з чэсцю выканаем гэту тваю запаведзь! *І. СТАЛІН*

На здымку: В. І. Ленін у Разліве. Карціна мастака Сокалава (Цэнтрэльны музей В. І. Леніна). Рэпрадукцыя (Фотахроніка ТАСС)

На здымку: В. І. Ленін сярод дэлегатаў III Усерасійскага з'

(М

Чалавек

Было гэта не так даўно і не так блізка, на вялікай зямлі, за высокімі гарамі ды за сінімі марамі. Цякла там рэчка глыбокая. І цяпер яна цячэ, луг поіць і людзей корміць. Быў там і я. Сцюдзёнай вадой умываўся, альховым лістом накрываўся, рыбу лавіў, сем год жыў. Сеці мае рыбацкія, а труды мае бурлацкія.

Раз я вышаў на лоў, на краснапёрую плотку, на карася шырокага, на галаўля глыбокага. Нада мной ноч чорная, пада мной зямля халодная. Толькі зрэдку зоркі-красоліны свецяць над лугам. Сяджу я і думу думаю сваю ўлюбёную, ды пазіраю на раку сцюдзёную. Добра думу думаці, а сецямі ваду муціць не так лёгка.

Цёмна-цёмначы з вечара да поўначы. Раптам асвяцілася неба красным полымем, светлым променем. Зорка—вока плоткіна—пракацілася па небу, асвяціла лугі і бары. Сонныя рыбы прачнуліся, заплёскалі шырокімі хвастамі, птушкі пазлятралі з насед сваіх. Толькі совы пахавалі галовы ў боязні святла зорчынага. Асвяцілася ўсё і хутка зноў стала цёмна.

Людзі кажуць: зорка ўпала—чалавек памёр. А я скажу пагаворку рыбацкую, правільную, як душа бядняцкая, светлую, як дзень майскі, чыстую, як вада крынічная,—чалавек нарадзіўся. Зорка тая, спадыш, зусім не прапала. Удалечы, дзе пачынаецца рэчка вірлівая, дзе стаяць дубы над берагамі, дзе шумяць травы над лугамі, паказалася яна, маленькая залатым зярном.

Вось коціцца зорка сярод віру крутога, сярод аіру густога, паміж лясоў і бароў. Свет яе зыркі асвятляе лугі росныя. Да яе плывуць рыбы краснапёрыя, ляцяць птушкі працавітыя, нахіляюцца траснікі жорсткія. А совы, крумкачы і ястрабы хаваюць вочы, налітыя крывёю нявінных.

Плыла, плыла зорка і супынілася ля кладзі рыбацкай.

— Чалавека,—праказала яна,—падыйдзі да мяне, калі маеш мазалі на руках крывавыя, кашулю на плячах дзіравую. Падыйдзі і захавай мяне ў цёмным бары, у зялёным гушчары, пабудуй мне шалаш, каб злоснікі не маглі знайсці. Бачыш—за мной гоняцца злыя людзі, мной ужаленыя звяры. Яны хочуць крыві маёй і тваёй крыві за тое, што я асвяціла цёмнач, за тое, што ты не любіш іх, як маладыя ўсходы марозу.

Паставіў я сеці, сеў у човен і паплыў на зоў-кліч дзіўнай зоркі. Прыплыў, і што-ж бачу. Бачу не зорку, а чалавека—яснае сонейка, чалавека велікана зямнога. Ён такі прыветлівы, быццам вецярок першы веснавы. Пасадзіў я дарагое сонейка ў човен і павёз каля берага стромкага да буктылясной. Мы вылезлі і пайшлі ў лес, а за намі прыплылі і яго спадарожнікі—ясныя зоркі.

Лёталі шмялі—трутні, крычалі—распіналіся совы, ваўкі нюхалі сцежкі—і ніяк не маглі напасці на след велікана. Толькі птушкі добрыя, спадарожнікі—свяцілы ды я ведалі тое месца. Цяклі дні за днямі, месяцы за месяцамі. У густы бор, пад стары дуб зляталіся птушкі-ластаўкі, выплывалі рыбы, прыходзілі людзі са спадарожнікамі чалавека-сонейка. Час-ад-часу прыбываў стан ясных сокалаў, папаўнялася раць спрытных воінаў. Усе, у каго мазалі на руках крывавыя,

Уходзячы ад нас, таварыш Ленін завяшчаў нам захоўваць адзінства нашай партыі, як зяніцу вока. Клянемся табе, таварыш Ленін, што мы з чэсцю выканаем і гэту тваю запаведзь!

І. СТАЛІН

Усерасійскага з'езда комсамола (1920 г.).
(Мастак Васільеў, выдавецтва „Искусство")
Рэпрадукцыя (Фотахроніка ТАСС)

На здымку: В. І. Ленін на Усерасійскім суботніку ў Крэмле. 1920 г.
Рэпрадукцыя (Фотахроніка ТАСС)

...авек-
...сонца

...адзіў кашулі на плячах дзіравыя, прыхо-
...павёз дзілі сюды, уліваліся ў раць вялі-
...буктыканскую.

...ў лес, Паплылі хмары па небу нізка.
...арож- Паказалася маланка блізка. Над
...налі— лугамі, над шырокімі палямі, у гарах
...охалі і лясах стала цёмна. Грымнуў пярун,
...ці на запаліў пахіленую асініну, дзе сядзелі совы нягодныя, вораны чорныя, ястрабы крыважадныя. Паліўся зямны град з волава і медзі. Успыхнула тады сонейка агнём-чырванню, пакацілася па шырокай зямлі, праз лугі і балоты, да вялікага горада, да залітага вострава, на палеткі бядняцкія, на промыслы рыбацкія. І ўсе, у каго мазалі крывавыя на руках, кашулі дзіравыя на плячах, рынуліся за ім, за яго спадарожнікамі-зоркамі.

Засвісталі стрэлы вострыя, забухалі стрэльбы грозныя. Застукалі коні капытамі круглымі. Замахалі сокалы крыламі сільнымі. Палілася кроў з ран нягоднікаў. Завязаўся бой не на жыццё—на смерць.

Ворагі не здаюцца, а наша раць мацнее. Ворагі страляюць, а мы іх агнём пячом, дымам выкурваем з гнёзд наседжаных. Ворагі плачуць, а мы радуемся нашай перамозе.

Абышло гэтак сонейка-чалавек тры разы зямлю шырокую, дзе ваяваў стан, дзе вастрылі воіны стрэлы новыя,—як рукой змяло сілу варожую. Пасвятлела. Загарэўся ўсход заравам чырвоным. Асвяціліся палеткі бядняцкія і промыслы рыбацкія. Залёталі птушкі-вольніцы, уздыхнулі лягчэй людзі бедныя. Стала светла і вольна на зямлі.

Злоснікі-нягоднікі дабіраліся да вялікага чалавека—не маглі падужаць. Толькі смерць сама пагасіла вочы ясныя, склала рукі моцныя, волю дужую, розум святлейшы. Чалавек-сонца, велікан сканаў. Як даведаліся аб гэтым яго воіны,—затужылі, засмуткавалі.

Папрылётвалі зноў птушкі-тружанікі, папрыходзілі людзі з сямі дарог, з чатырох бакоў у вялікі горад, каб паглядзець на ясны твар дарагога бацькі, чалавека-сонца. Пацямнелі лугі зялёныя, затуманіліся горы светлыя, зашумеў сумную песню бор векавечны, захваляваліся і застагналі ад суму рэкі і моры.

Жалка, да болю жалка такога чалавека. Музыкі нацягнулі струны, навашчылі смыкі, узялі трубы медныя і зайгралі жалобную песню над мёртвым веліканам. Узнялі гроббацькі яго спадарожнікі-свяцілы, яго сыны, дзеці і ўнукі і на сваіх плячах панеслі па каменнай вуліцы вольнага горада да вялікага дома гранітнага. Угары над ім закружыліся засмучоныя птушкі. Нясуць людзі труну і плачуць. Льюцца слёзы ракой, Волгай-матушкай.

Прышлі. І людзі, і птушкі-спадарожнікі—усе, каго збавіў ён ад мазалёў крывавых і кашуль дзіравых, нахіліліся да яго, апошні раз паглядзелі на ясны твар і зарыдалі. Зарыдалі гудкі, зашумеў бор, і мора загаласіла. Тры разы стрэліла цар-пушка на шырокай вуліцы, ля гранітнага дома, дзе замуравалі людзі свайго бацьку роднага, сокала гордага, смелага воіна, чалавека—ясна сонейка. Тады ўзышоў чалавек—ясна зоранька, веліканаў спадарожнік, ваявода ў даўгім шынелі на высокую веранду грабніцы і шырокай кісцяй залатымі літарамі напісаў на ёй вялікае слова: ЛЕНІН.

Казка запісана ў калгасе „Комінтэрн", Бобрскага сельсовета, Крупскага раёну.

Сталінскія клопаты аб людзях

Рабочы калектыў фабрыкі „Везувій“ з вялікім адабрэннем сустрэў пастанову СНК СССР, ЦК ВКП(б) і ВЦСПС „Аб мерапрыемствах па ўпарадкаванню працоўнай дысцыпліны, паляпшэнню практыкі дзяржаўнага сацыяльнага страхавання і барацьбе са злоўжываннямі ў гэтай справе“. Да гэтай гістарычнай пастановы на нашай фабрыцы было асабліва многа агіднасцей. Цякучасць рабочай сілы была велізарная. Фабрыка напамінала прахадны двор. Многія сімулянты жылі больш за кошт дзяржавы па бюлетэням, чым працавалі. У нас было таксама многа фактаў, калі работніца, прапрацаваўшы 2—3 месяцы, атрымоўвала дэкрэтны адпачынак і больш на работу не з'яўлялася.

Няправільна размяркоўваліся ў нас пуцёўкі ў дамы адпачынку і на курорты. І тут рвачы прыкладалі сваю руку, а старыя кадравыя рабочыя і работніцы часта аказваліся непрыкмечанымі. Вось работніца Хамякова прапрацавала 28 год на фабрыцы, а ў доме адпачынку была ўсяго адзін раз. Ці работніца Еўдашэнка, маючая 20-гадовы стаж работы ні разу не была ў доме адпачынку, ні на курорце. Таксама Мураўцава і другія. Я сама прапрацавала 33 гады, з іх 16 год на гэтай фабрыцы, а ў доме адпачынку была ўсяго два разы. Былі ў нас і такія факты, што людзі толькі што сыйшоўшыя са школьнай лаўкі, прапрацаваўшы пару месяцаў, зноў ішлі вучыцца, а старым кадравым рабочым адмаўлялі ў пасылцы на вучобу.

Пастанова партыі, урада і прафсаюзаў з'яўляецца выключна важным дакументам, які накіраван на яшчэ большае ўзмацненне магутнасці нашай краіны. У гэтай пастанове адчуваюцца Сталінскія клопаты аб кадравых рабочых і служачых. Ужо цяпер у нас ёсць вялікі пералом у рабоце. Значна зменшыліся спазненні і прагулы на работу. Вось работніца Лагойда з каробачнага цэха часта рабіла прагулы. У яе знаходзіліся розныя прычыны, а цяпер, пасля пастановы, тав. Лагойда акуратна прыходзіць на работу, спазненняў ў яе няма. Справіліся і другія работніцы.

На нас, майстраў, пастанова накладае асаблівыя абавязкі. Мы павінны ўсямерна змагацца за ўмацаванне працоўнай дысцыпліны і за ўплатненне працоўнага дня. Я пастараюся апраўдаць званне майстра сацыялістычнага прадпрыемства. З усімі лодырамі, прагульшчыкамі, рвачамі буду паступаць так, як гэтага патрабуюць інтарэсы радзімы.

Майстар цэха ф-кі „Везувій“ Шэвелева.

Нова-Беліца.

ДЗЯРЖАВА ПАТРАБУЕ І РАБОЧЫ КЛАС ПАДТРЫМЛІВАЕ ГЭТА ПАТРАБАВАННЕ, КАБ УСТАНОЎЛЕНАЯ ЗАКОНАМ ПРАЦЯГЛАСЦЬ РАБОЧАГА ДНЯ ЗАХОЎВАЛАСЯ Ў ДАКЛАДНАСЦІ І БЕЗ УСЯКІХ ПАРУШЭННЯЎ...

(З пастановы СНК СССР, ЦК ВКП(б) і ВЦСПС)

АПРАЎДАЮ ЗВАННЕ МАЙСТРА

З першых-жа дзён правядзення ў жыццё пастановы СНК СССР, ЦК ВКП(б) і ВЦСПС „Аб мерапрыемствах па ўпарадкаванню працоўнай дысцыпліны, паляпшэнню практыкі дзяржаўнага сацыяльнага страхавання і барацьбе са злоўжываннямі ў гэтай справе“ ў нас значна палепшылася працоўная дысцыпліна. Амаль зусім спыніліся спазненні на работу.

Раней у нас так звыкліся са спазненнямі, што не рэгістравалі іх колькасці. Бывалі выпадкі, што спазняліся на гадзіну і больш. Была і такая расхлябанасць, каму трэба было прыходзіць на першую змену—прыходзіў на другую. Мы, майстры, як і адміністрацыя цэха не звярталі на гэта ўвагі. Колькі ўбытку дзяржаве прыносілі зрыўшчыкі працоўнай дысцыпліны!

Пачынаючы з 2 студзеня ў нас у цэху бываюць па 1—2 спазненні. Гэтага таксама не павінна быць. Вось я працую ў друкарні 18 год і за ўвесь час не спазнілася ні на мінуту. У нас створаны ўсе ўмовы для таго, каб кожная работніца магла прадукцыйна працаваць. Дзеці работніц забяспечаны добрым доглядам у дзіцячых садах і яслях. Работу буфета таксама перабудавалі так, каб не было чаргі. Кожная брыгада абедае ў розны час.

Я, як майстар змены, абавязваюся рашуча і няўхільна змагацца за ўстанаўленне ўзорнай працоўнай дысцыпліны ў цэху.

С. Цырліна.

Менск, друкарня імя Сталіна.

ЛОДЫРАМ НЕ МЕСЦА НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ

Я працую на фабрыцы імя Кагановіча 8 год. З дня ў дзень перавыконваю план выпрацоўкі, давала да 201 проц. На працягу 8 год у мяне няма спазнення нават на адну мінуту. За добрую работу была пяць разоў прэміравана.

За 8 год работы на фабрыцы я бачыла многа прагульшчыкаў, дэзарганізатараў вытворчасці, для якіх прадпрыемства—гэта прахадны двор. Зараз за разгільдзяйства, за прагулы зняты з работы Стасевіч, Дудзінская, Ціхановіч. Атрымалі вымовы за спазненні Кручок, Петрашова, Фішэр, Ермольчык.

З вялікай радасцю я сустрэла пастанову партыі і ўрада, якая дае магчымасць навесці яшчэ больш узорны парадак і дысцыпліну на нашых соцыялістычных прадпрыемствах. Не павінна быць месца на вытворчасці лодырам і прагульшчыкам.

Іда Грэбштэйн.

Менск.



Вадзіцелі ПАЯЗДОЎ

Марусю Янчук з дзяцінства цягнула на паравоз. Гэта было яе марай і жаданнем. „Няма больш ганаровай работы, чым быць машыністам паравоза,"— заўсёды думала яна. Перад сабой тав. Янчук паставіла мэту—абавязкова стаць вадзіцелем паяздоў. Гэту мару яна пачала настойліва ажыццяўляць.

У 1930 гадзе Марыя Янчук паступіла ў паравознае дэпо Орша. Пачала працаваць слесарам-інструментальшчыкам. Яна ведала, што добрым машыністам можа стаць той, хто як след авалодае тэхнікай рамонта паравоза, будзе ведаць усе часткі, усе капрызы гэтай машыны. Вось чаму яна так энергічна стала працаваць слесарам, увесь час была стаханаўкай. Праз некаторы час яна ўжо была памочнікам машыніста. Адразу-ж тав. Янчук атакавалі адсталыя людзі: „Толькі не на паравозе табе працаваць",—злосна, прама ў вочы гаварылі яны гэтай энергічнай дзяўчыне. Прышлося цярпець крыўду і справай аправяргаць гэтыя разважанні. Працуючы памочнікам машыніста, яна паказвала ўзоры работы. І ўсё-ж праз 10 месяцаў яе прымусілі пакінуць любімы паравоз.

1938 год. 14 жніўня. Першая жанчына-машыніст ордэнаносец, цяпер начальнік Маскоўска-Акруговай дарогі Зінаіда Троіцкая са сваімі таварышкамі Аннай Кошкінай і Марыяй Федосевай паспяхова правялі поезд ад станцыі Масква-сартыровачная Ленінскай чыгункі да станцыі Куроўская.

Любімы сталінскі нарком тав. Л. М. Каганавіч у тэлеграме да брыгады Зінаіды Троіцкай пісаў: „Жанчыны чыгуначнага транспарта і жонкі чыгуначнікаў павінны паследваць прыкладу Троіцкай — авалодаць тэхнікай кіравання лакаматывам, гэтай асновай рухаючай сілы чыгуначнага транспарту".

Горача адгукнулася на гэты заклік Маруся Янчук. Радасці не было канца, калі яна даведалася, што на транспарце, у тым ліку і пры дэпо Орша, ствараюцца курсы памочнікаў машыністаў для жанчын. Яна першай падала начальніку дэпо заяву з просьбай прыняць яе на курсы. 25 верасня 1938 года тав. Янчук, як і астатнія 34 жанчыны, пачала вучыцца на 6-месячных курсах. Сур'ёзна ўзялася яна за вучобу. Усе прадметы пачала здаваць на выдатна. Хутка яе, як перадавую курсантку, выбіраюць старастай курсаў. Яна цікавіцца, як займаюцца другія курсанткі, выяўляе прычыны адставання, дапамагае ім авалодаць тэхнікай складанай машыны.

Вучоба на курсах ідзе поўным ходам. Палову навучальнага часу курсанткі скарыстоўваюць для вытворчай практыкі. У цэхах дэпо, каля рабочых верстакоў, паравозаў можна бачыць у камбінезонах жанчын, занятых слясарнай справай.

Марыя Янчук разам са сваёй таварышкай Елізаветай Козінай першымі пачалі практычныя паездкі на паравозах з паяздамі. 4 студзеня поезд вагой у 1315 тон ішоў з Оршы да Барысава. Памочнікам машыніста ехала тав. Янчук і качагарам тав. Козіна. Састаў быў дастаўлен своечасова. 6 студзеня Аршанскія чыгуначнікі сустрэліся з героем Совецкага Саюза, знатнай лётчыцай нашай прыгожай радзімы Палінай Осіпенка. У гонар прыезда Паліны Осіпенка, тт. Янчук і Козіна, разам з інструктарам-машыністам тав. Гуляевым, рашылі прывесці з Оршы да Смаленска кур'ерскі поезд № 2. Дакладна выконваючы інструкцыю аб рабоце ў зімовых умовах, правілы тэхнічнай эксплуатацыі, поезд № 2 у Смаленск прыбыў на 5 мінут раней. Назад ішлі з пасажырскім поездам № 41. У Оршу прыбылі дакладна па распісанню. Па водгуках машыніста-інструктара тав. Гуляева курсанткі тт. Янчук і Козіна паказалі добрыя ўзоры ў рабоце, уменне даглядаць за паравозам.

Гэтымі паездкамі тт. Гуляеў, Янчук і Козіна на справе даказалі магчымасць паспяховай работы ў зімовых умовах, што пры сумленных адносінах да справы, ніякія цяжкасці зімы не страшны. Намеснік начальніка Заходняй дарогі тав. Дзедук абвясціў тт. Гуляеву, Янчук і Козінай падзяку.

Таварышы Янчук і Козіна абавязаліся ў бліжэйшыя дні ехаць з цяжкавагавым поездам, вагой не менш 1500 тон. Яны заяўляюць:

— Курсы мы скончым на „выдатна" і паязды заўсёды будзем вадзіць так, як іх вадзіў Крыванос і Агнёў.

ст. Орша. **А. Клебча.**

Друкарня „Октябрьский натиск" (Уфа) друкуе „Кароткі курс гісторыі ВКП(б)" у перакладзе на башкірскую мову.

На здымку: Бракаўшчыца пераплётнага цэха друкарні В. Ф. Выпрэва за праверкай якасці гатовых кніжак.

Фотахроніка В. Башкірава (ТАСС)

ПРАЦАВАЦЬ, як вучыў Ленін

В. І. Ленін у свой час пісаў аб цяжкім лёсе і жыцці настаўніцтва ў Расіі: „Да, рускія народныя настаўнікі загнаны, як зайцы". (Ленін, т. XVI, стар. 136). У другім месцы Владзімір Ільіч гаварыў: „Расія бедная, як толькі гутарка ідзе аб жалаванні народным настаўнікам, ім плацяць жалкія грашы. Народныя настаўнікі галадаюць і мерзнуць у нятопленых і амаль нежылых хатах. Народныя настаўнікі жывуць разам з жывёлай, якую сяляне ўзімку бяруць у хату. Народных настаўнікаў цкуе любы ўраднік, любы вясковы чорнасоценец, альбо добравольны ахраннік і сышчык, не гаворачы ўжо аб прыдзірках і праследваннях з боку начальства." (Ленін, т. XVI, стар. 411).

Толькі совецкая ўлада і комуністычная партыя стварылі настаўніку найлепшыя ўмовы для плодатворнай работы. І совецкае настаўніцтва добра ведае моц і жывіцельную сілу сталінскіх клопатаў аб чалавеку. Не было і няма нідзе ў свеце такіх умоў, якія ён мае ў нашай социялістычнай краіне.

Да Кастрычніцкай рэволюцыі 75 проц. насельніцтва Беларусі было няграматным, а сярод жанчын няграматнасць складала 90 проц. Большасць дзяцей школьнага ўзроста не мела магчымасці вучыцца ў школах. У Беларусі было 4171 школа, прычым большасць з іх былі царкоўна-прыходскія школы, і ў іх абучалася толькі 264.776 дзяцей.

Зараз у Беларусі няма ніводнага сельсовета, дзе не было-б адной, двух, а часамі і трох школ. У БССР зараз 7064 школы, з іх начальных 5042, няпоўных сярэдніх 1417 і сярэдніх школ 605. У школах займаюцца 1 мільён 66 тысяч 103 вучні.

За годы другой сталінскай пяцігодкі пабудавана ў Беларусі звыш 500 новых Сталінскіх, найлепш абсталяваных, школ.

Ці-ж гэта не з'яўляецца ярчайшым прыкладам шпаркага росту культурнасці беларускага насельніцтва.

Велізарная большасць настаўніцтва Совецкай Беларусі прарабіла вялікую творчую работу, значна ўзняла якасць абучэння і комуністычнага выхавання дзяцей. У мінулым годзе тысячы настаўнікаў далі 100 проц. паспяховасці вучняў. Найлепшыя майстры педагагічнай справы тт. Ліхачова З. В. з 25 школы г. Менска, Міляўская К. І. з першай сярэдняй школы г. Віцебска, М. Н. Трушнікава з 11 сярэдняй школы г. Менска, А. Г. Блау з 10 школы Віцебска, Левіна-Гразоўская Х. Х. з 28 сярэдняй школы г. Менска, Б. А. Дашук з першай сярэдняй школы горада Оршы, А. Д. Сіўко з Салтанаўскай сярэдняй школы, А. Ф. Бародзіч з 5 сярэдняй школы г. Полацка і многія другія.

Гэты спіс далёка няпоўны. У БССР ёсць сотні настаўнікаў, даўшых за першую і другую чвэрць года высокі процант паспяховасці вучняў.

Але мы маем яшчэ рад настаўнікаў, якія працуюць дрэнна, даюць нізкую паспяховасць вучняў. Асноўнай прычынай гэтага з'яўляецца няправільная арганізацыя ў гэтых школах вучэбна-выхаваўчай работы, парушэнне дырэктыў партыі і ўрада аб навучанні і комуністычным выхаванні.

Найбольш нізкую паспяховасць школы даюць па беларускай і рускай мовах. У многіх настаўнікаў адсутнічае сістэматычнае паслядоўнае выкладанне граматычнага матэрыялу на ўроках. Вельмі часта сустракаюцца факты шкоднага механічнага завучвання правіл, недастатковае падмацаванне іх адпаведнымі граматычнымі практыкаваннямі. Недастаткова добра арганізавана работа над выпраўленнем памылак. Зусім дрэнна праводзіцца работа па развіццю вуснай мовы вучняў.

Урокі мовы і літаратуры не выкарыстоўваюцца для развіцця культуры мовы. Адсутнасць розных відаў пісьмовых работ (творчыя дыктанты, пераказы, творы і г. д.), вельмі тармозяць павышэнне граматнасці. Адсутнічае таксама барацьба за чыстату і культуру мовы на іншых уроках.

У другім паўгоддзі задача кожнага настаўніка працаваць упарта, напружана, па-большэвіцку з тым, каб у гэтым годзе канчаткова ліквідаваць другагодніцтва.

Трэба прыняць рашучыя меры па палепшанню ўсёй выхаваўчай работы. Характэрнай рысай нашых школ з'яўляецца неадлучнасць выхаваўчай работы ад вучэбнай. У школах, добра паставіўшых выхаваўчую работу, ёсць і больш высокая паспяховасць. У гэтай рабоце настаўніцтву павінны дапамагчы комсамольскія арганізацыі, якія не заўсёды звяртаюць належную ўвагу на гэту справу.

Аднак, выхоўваць дзяцей у комуністычным духу ёсць прамы абавязак не толькі школы, але і бацькоў. З гэтай мэтай неабходна праводзіць сістэматычную работу з бацькамі, стварыць у кожнай школе, у кожным класе бацькоўскі актыў. Бацькі павінны рабіць уплыў на вучняў, каб яны добра сябе вялі па-за школай, своечасова і ўнікліва выконвалі хатнія заданні.

Высокую якасць вучэбнай работы і работы па комуністычнаму выхаванню дзяцей даюць настаўнікі, якія сістэматычна працуюць над павышэннем свайго ідэйна - палітычнага ўзроўню. Кожны настаўнік павінен дасканала аўладаць навуковай тэорыяй Марксізма-Ленінізма.

Кожны настаўнік Совецкай Беларусі павінен сумленна адносіцца да сваіх абавязкаў, павінен працаваць як вучыў вялікі стратэг рэволюцыі В. І. Ленін і як вучыць таварыш Сталін.

Новікава.

Загадчык аддзела сярэдніх школ НКА БССР.

Год таму назад

Цягнік падыходзіў да сэрца СССР — Масквы. Была палова студзеня 1938 года. У гэтыя дні ў Маскве праходзіла Першая Сесія Вярхоўнага Совета СССР — засядаў совецкі парламент, выбраны ўпершыню, на аснове Сталінскай Канстытуцыі. Наша дэлегацыя ад Беларусі ў складзе лепшых байцоў Чырвонай Арміі, пагранічнікаў, рабочых стаханаўцаў заводаў, лепшых калгаснікаў, совецкай інтэлігенцыі пад'язджала да Масквы.

19 студзеня нам паведамілі, што сёння мы ідзем на Сесію, што сёння засядае разам Совет Саюза і Совет Нацыянальнасцей. Хутка мы былі ў Крэмлі. Зайшлі ў Малы зал паседжанняў у той час, калі таварыш Молатаў гаварыў сваю прамову па абгаварэнню кандыдатур у склад Совета Народных Камісараў. Пасля прамовы тав. Молатава быў абвешчан перапынак. У часе перапынка мы ўважліва разглядалі ўдзельнікаў Сесіі, яны падыходзілі да нас, гутарылі з намі. Тут былі людзі розных нацый, усіх абласцей і рэспублік нашай неабдымнай многанацыянальнай краіны, сярод іх былі дэлегаты з далёкай поўначы, з паўднёвага ўсхода, Закаўказзя і г. д. Многія дэпутаты былі ў нацыянальных касцюмах. Мы бачылі ордэнаносцаў, герояў СССР,—адчувалася адзіная дружная сям'я лепшых прадстаўнікоў нашай радзімы.

Перапынак быў скончан. Сесія працягвала сваю работу. Прыбыўшыя дэлегацыі ад працоўных Масквы, Ленінграда, УССР віталі Сесію Вярхоўнага Совета.

Але вось старшыня абвясціў, што ад працоўных БССР прышла дэлегацыя вітаць Сесію Вярхоўнага Совета. Мы ўвайшлі ў зал паседжанняў. Велізарны прыгожы зал увесь быў заліт святлом. Нас сустрэлі вельмі цёпла. Адчувалася вялікая дружба народаў СССР. Пачуцці радасці не ўмяшчаліся ў грудзях. Цяжка перадаць тыя радасныя перажыванні, якія запоўнілі маё сэрца ў гэты час,—такой радасці не было ніколі ў маім жыцці. Слова ад нашай дэлегацыі атрымаў рабочы стаханавец завода імя Молатава тав. Кускоў.

Прамова часта прарывалася бурнымі працяглымі апладысментамі, усе ўставалі, калі ўспаміналі імя тварца самай дэмакратычнай Канстытуцыі ў свеце таварыша Сталіна.

Стоячы ў поўабарот к прэзідыуму мы глядзелі на зал паседжанняў і на прэзідыум і кожны з нас сярод членаў прэзідыума шукаў вачыма друга і настаўніка працоўных усяго свету таварыша Сталіна. Але ў першыя мінуты мы яго не бачылі. Мне думалася, што таварыш Сталін знаходзіцца на ўзвышанай часці прэзідыума, аказалася не так: таварыш Сталін быў недалёка ад нас, стаяў побач з тав. Жданавым і апладыраваў разам з усімі.

Тав. Кускоў скончыў вітаць Сесію Вярхоўнага Совета і потым падышоў да таварыша Сталіна і сказаў: „Дзякуй вам, таварыш Сталін за наша шчаслівае жыццё". У адказ на гэта таварыш Сталін паціснуў руку Кускову і адказаў „: Дзякуй і вам".

Гэта дзякуй таварыш Сталін перадаў працоўным БССР — слаўным пагранічнікам, зорка ахоўваючым нашы рубяжы ад ворагаў, гэта дзякуй таварыш Сталін перадаў стаханаўцам — чэсным працаўнікам горада і вёскі; гэта дзякуй перадаў таварыш Сталін совецкай інтэлігенцыі БССР — чэсна, па сталінску працуючай на ўсіх участках нашага соцыялістычнага будаўніцтва, нашым лепшым настаўнікам, нашым дзецям, добра і выдатна авалодваючым асновамі навукі.

Прайшоў год. Наша краіна пераможна ідзе ўперад у сваім развіцці пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі. Многа выдана мудрых законаў, якія даюць магчымасць далейшаму ўздыму і росквіту творчасці ва ўсіх галінах нашага жыцця. Мне хочацца працаваць яшчэ лепш, каб апраўдаць тое велізарнае давер'е, якое дадзена настаўніку совецкай школы.

Валенціна Нікалаеўна Журык—настаўніца заалогіі і батанікі і загадчык навучальнай часткі 4 школы.

Менск.

На Магілеўскай швейнай фабрыцы імя Валадарскага па цэхах праводзяцца гутаркі і чыткі, прысвечаныя 15-й гадавіне з дня смерці В. І. Леніна.

На ЗДЫМКУ: (сядзіць першая справа) інструктар цэха дэпутат Вярхоўнага Совета БССР тав. Акуленак А. І. праводзіць гутарку з стаханаўкамі свайго цэха аб жыцці і дзейнасці В. І. Леніна.

Фота Розельмана (Фотахроніка БЕЛТА).

А. Стаховіч

Наташа

(*Апавяданне*)

Па густа абвітай зялёным плюшчам верандзе, усхваляванa хадзіў малады чалавек. Сёння ён прышоў раней умоўленага часу, і па яго залішняй рухомасці і ўзнятасці, Наташа заўважыла, што Апанас хоча сказаць ёй нешта важнае, незвычайнае. Яна любіла слухаць Апанаса, ды і сама не скупілася на гаворку і нярэдка па вечарах з веранды чуўся здаровы смех юнакоў.

— Які цудоўны вечар...—заглядаючы ў іскрыстыя вочы дзяўчыны, пачаў Апанас.

Але інстынктыўна Наташа адчувала, што Апанас хоча сказаць ёй сёння не пра цудоўны вечар, а пра нешта больш цікавейшае, і яна перабіла яго:

— Ну, гавары ўжо, Апанас. Бачу, што ты мне нешта хочаш сказаць.

— Сказаць.—І ён узяў Наташу за руку.—Я хачу ведаць, калі ўжо ты пяройдзеш да мяне.

— Як гэта „пяройдзеш да мяне"?— з усмешкай перапытала Наташа.

— Не, я сур'ёзна пытаю...

Хоць Наташа ўжо даўно ведала намеры Апанаса і часта думала пра іх, але цяпер ёй здавалася, быццам усё гэта нечакана.

— Ну, дык, як Наташа?..—нецярпліва пытаўся Апанас.

Наташа маўчала.

Незразумелае для Апанаса задуменне апанавала яе.

— Што з табой, Наташа? Няўжо...

— Не, не. Апанас. Не пра гэта я... У мяне ёсць перашкода...

— Ну, дык раскажы, Наташа.

Наташа глянула на ўсхваляваны твар Апанаса і папраўляючы непаслухмяную пасмачку сваіх густых валасоў,—пачала гаварыць:

— Гэта было два з лішнім гады таму назад. Аднойчы, у ясны, сонечны дзень я ішла па вуліцы. З узгоркаў па рэйках цурчэлі ручайкі, у паветры пахла вясною... На скрыжаванні вуліц два невялічкія хлапчукі пускалі папяровыя карабельчыкі. Загуляўшыся, яны не заўважылі, як адразу з двух бакоў імчаліся машыны, а па рэйках са звонам ляцеў трамвай... Я крыкнула: дзеці, сцеражыцеся! Адзін хлапчук, што ў шэранькай шапцы, паспеў адскочыць у бок, а другі разгубіўшыся, паслізнуўся і ўпаў на рэйкі. Я падбегла да хлопчыка і толькі паспела схапіць яго за адзежыну і адцягнуць ад рэек, як нешта цяжкае з сілай ударыла мяне ў пясніцу... Я ўпала на брук... У вачах стала цёмна, здавалася я лячу ў нейкае шурпатае, калючае бяздонне... І зусім не памятаю, як апынулася ў больніцы... А перад тым, як выпісацца з больніцы, да мяне ў палату прыйшоў пажылы, з бліскучай лысінай хірург.

— Я толькі хацеў папярэдзіць вас,— сказаў ён,—што пасля гэтай аперацыі вам нельга мець дзіцяці.

— Якая неасцярожнасць...—прагаварыў Апанас,—але гэта не можа быць перашкодай у нашым каханні.

* * *

Калі Апанас, ідучы з работы, часам заходзіў па Наташу ў дзіцячы сад, дзе яна працавала кіраўніцай, да яго гуртам спяшаліся дзеці.

— Дзядзя, дзядзя прыйшоў,— у адзін голас крычалі малыя.

Ён даставаў з кішэні цукеркі, частаваў дзяцей, расказваў ім цікавыя казкі, а яны, узяўшы яго за рукі, цягнулі ў свой карагод, і Апанасу не раз даводзілася гуляць з імі ў коціка і мышку.

Наташа глядзела на Апанаса і думала пра сябе:

— Няўжо я не змагу мець дзіцяці... А можа хірург памыліўся.

І Наташа пачала раіцца з дактарамі. Яна наведала больш дзесяці ўрачоў, абыйшла кансультацыі, больніцы, але ўсюды чула адзін і той-жа адказ:

— Вам нельга...

— Вы рызыкуеце сваім жыццём...

— Мы забараняем вам...

Нарэшце звярнулася да славутага прафесара.

Апанас сядзеў у прыёмнай і з нецярпеннем, як малое дзіця чакае незвычайнага падарунку,—чакаў Наташу.

Вось яна вышла ад прафесара, зірнула на мужа і ціха сказала:

— Можна.

— Што ты кажаш, Наташа?

— Можна, кажу.—Зноў паўтарыла яна.

— Дык ён... ён дазволіў табе,—ідучы дадому імкнуўся дакладней даведацца Апанас.

— А хопіць табе ўжо, кажу дазволіў...—увесь час ухілялася Наташа ад гаворкі пра гэта, што надзвычай хвалявала Апанаса і сеяла ў яго думках пэўнае сумненне.

* * *

Вечарамі Наташа расчыняла куфэрак, перакладвала маленькія фланелевыя распашоначкі і яе ўсё больш непакоіла думка:

„Сказаць яму ўжо, ці яшчэ пачакаць крыху..."

А дні ішлі.

І калі Наташа ўжо ясна адчула сваё дзіця, яна прызналася Апанасу.

— Ты толькі не палохайся, Апанас...—пачала яна.

— Ну, што, што. Гавары, Наташа.

Іх позіркі, сустрэўшыся, застылі на момант і ў пакоі заціхла.

— Мне не дазволіў прафесар, але я рашыла сама.

— Сама!—прагучэў яго разгублены голас.

— Не хвалюйся, не хвалюйся, Апанас...—супакойвала жонка.—У мяне хопіць сілы, каб перанесці аперацыю... Затое ў нас...

І зноў у пакоі заціхла.

Разгублены Апанас пазіраў на спакойна сядзеўшую Наташу, то на маленькі чысценькі ложачак, які ён купіў і паставіў у куточку. Яму вельмі хацелася мець дзіця, быць сапраўдным бацькам і ў той-жа час ён вельмі непакоіўся за жыццё Наташы.

* * *

Неяк увечары, Наташа адчула сябе нядобра. Яна прысела на краюшак ложка і паклікала Апанаса.

— Трэба ехаць,—сказала яна.

Апанас кінуўся да тэлефона.

— Машыну. Прашу машыну...—чуўся ў пакоі яго ўсхваляваны голас.

У тую ноч Апанас блукаў па доўгаму і вузкаму калідору больніцы. Ён прыслухоўваўся да кожнага гуку і ў кожным енку хворага яму здаваўся голас Наташы. Ён чуў удары свайго сэрца і кожны нерв яго быў настолькі напружаны, што досыць было рыпнуць дзвярыма, каб выклікаць у яго яшчэ большае хваляванне.

Наташа ляжала на белым аперацыйным стале. Пакой быў заліты электрычным святлом. Навокал стала стаялі ўрачы ў беласнежных халатах і марлявых масках. Сястра ўвесь час трымала Наташу за руку, сочачы за пульсам.

Наташа ціха стагнала. Ад болю і патуг твар яе пакрываўся халодным потам, на ілбу з'яўляліся складкі, а губы сохлі ад смагі.

— Спакойна... Спакойна... Лічыце,— сказаў доктар,—накладваючы на твар Наташы маску з хлараформам.

— Раз, два, тры, чатыры...—пачала лічыць Наташа, але язык пачаў дзервянець, рэчы рабіліся няяснымі, нібы пакрываліся туманам, гукі пачалі замірaць і аддаляцца...

— Дваццаць адзін...—ледзь праказала Наташа і змоўкла.

Яе спавіў глыбокі сон...

* * *

— Віншую з сынам!—Вось першыя словы, якія пачула ачуняўшая Наташа з вуснаў сівабародага хірурга.

На пухлых губах знясіленай жанчыны з'явілася ўсмешка і слёзы ўдзячнасці бліскануліў яе вачах.

— Паведаміце мужа,—папрасіла яна.

Прафесар выйшаў за дзверы. Ён па сходцах сышоў уніз, і адразу заўважыў чалавека, які шпацыраваў па калідору.

— Гэта вы настаўнік Філімонаў?

— Я, я,—амаль бягом падскочыў да хірурга Апанас.

— Сын у вас... і жонка адчувае сябе добра...

— Добра... дзякую...—прагучэў голас Апанаса і ён моцна абняў старыка.

А на другім паверсе, у невялічкім ложачку, пад цёпленькай коўдрай, варушыўся, дужаў, нарабіўшы столькі клопату—маленькі, чарнявенькі хлапчук.

НАМ ПІШУЦЬ

МОЙ РОСТ

Гэта было ўвосень 1931 года. Дзяўчаты вёскі Халоблін, Чэрыкаўскага раёна збіраліся ісці ў заработкі на завод. Запрасілі і мяне. Я з радасцю пайшла.

На заводзе прынялі мяне прыбіральшчыцай. За работу ўзялася шчыра. У жаночае свята—8 сакавіка—атрымала прэмію. „Маю работу цэняць“,—з радасцю падумала я.

Потым пайшла працаваць у брыгаду па здабычы сыравіны ў кар'еры. Гэта была цяжкая работа, але было дзе разгарнуцца. Брыгада была перадавой. Мяне шмат разоў прэміравалі і хутка прызначылі наглядаць за маторам у насоснай. Потым вылучылі на больш адказную работу—матарысткай пад'ёмніка. Рос завод, а разам з ім і я. Стала комсамолкой.

Мяне паслалі на практыку на адзін з матавозаў. Праз некаторы час ужо самастойна кіравала гэтай машынай. Цяжка было, але я ўпарта авалодвала тэхнікай сваёй работы.

Па ўсёй нашай краіне пракацілася хваля стаханаўскага руху. Не стаяў у баку і наш завод. Першым стаханаўцам—ініцыятарам стаханаўскага руху ў памольным цэху—быў мельнік тав. Серожкін, па ЦЭС—памочнік машыніста турбіны тав. Кузьменкоў, а ў кар'еры і сярод работніц завода першай стаханаўкай была я.

На курсы шафёраў паступіла па прапанове сакратара комсамольскага камітэта. Вучыцца на курсах без адрыву ад вытворчасці было не лёгка. Падрыхтоўка ў мяне слабая, сярод мужчын была адна, іншы раз не верылася: ці будзе толк з усяго гэтага? Але таварыская падтрымка комсамольскай арганізацыі давала мне ўпэўненасць у поспехах.

Не забуду таго часу, як я ўпершыню ўзяла штурвал машыны ў свае рукі. Сабраліся курсанты, рабочыя. Адны кажуць,—праваліць, а другія—яна ў нас баявая. Машына ў маіх руках паслухмяна хадзіла паміж слупоў, брала пад'ёмы. І я атрымала акуратна загорнутую шэрую кніжачку шафёра, у якой запісана: „мае права кіраваць аўтамабілем“...

Крычаў. **Е. Г. Овсянікава.**

Пачэсная работа

Тры гады я працую ў сістэме совецкага гандлю. Першы год працавала за прылаўкам прадаўшчыцай. З работай спраўлялася не дрэнна. Таму хутка мяне вылучылі загадчыкам аддзела. Зараз я працую загадчыкам магазіна.

Сваю работу я вельмі люблю, задаволена ёю. Цэлыя дні праводжу ў магазіне. Працую за прылаўкам, нараўне з прыказчыкамі і маю сваю работу, як загадчык магазіна. Акрамя гэтага мне патрэбна самой весці і шчотную работу.

Асноўнае ў нашай рабоце—ўмела і хутка адпускаць пакупнікоў, ветліва абыходзіцца з імі. За ўсе тры гады работы ў магазіне не маю ні адной скаргі ад пакупнікоў. За добрую работу часта атрымоўваю падзякі.

З выкананнем плана па магазіну справа ў нас абстаіць таксама добра. План заўсёды перавыконваем. На практыцы работы я пераканалася, што для хуткага выканання і павелічэння плана таваразвароту неабходна, каб асартымент тавараў быў самы шырокі, каб кожны дзень былі новыя тавары ў магазіне. Вось гэтага я і дабіваюся. Магазін мой таварамі заўсёды забяспечан. Калі і ёсць што-небудзь дэфіцытнае, то я таксама стараюся атрымаць яго па разнарадцы для магазіна.

Нядаўна ў мяне памёр муж. Я асталася адна з чатырмя дзяцьмі. Крыху цяжкавата, але совецкая ўлада, комуністычная партыя і наш дарагі Іосіф Вісарыёнавіч Сталін дапамагаюць мне, як і тысячам такіх жанчын, у выхаванні дзяцей. Старэйшая дачка займаецца ў тэхнікуме. Чатырнаццацігадовы сын—у 7 класе, а малодшы—у 4. Самая маленькая дачка ходзіць у дзіцячы сад. Усе яны вучацца добра, і гэтым бясконца радуюць мяне. Я выхаваю з сваіх дзяцей гарачых патрыётаў сваёй радзімы:

Берта Майсееўна Стыро.

Орша.

У рэспубліканскай Іспаніі.
На здымку: За снеданнем у адным з дзіцячых садоў Барселоны.
(Фотахроніка ТАСС)

КЛОПАТЫ АБ МАЦІ І ДЗІЦЯЦІ

На станцыі Орша адчыніўся новы вакзал. З яго адкрыццём пашырыўся і пакой маці і дзіцяці. Гэта прыгожая, добра абсталяваная зала. Тут можна не толькі добра адпачыць, але і атрымаць кансультацыю і параду па любых, цікавячых вас, пытаннях. Ёсць душ. Дзецям выдаецца чыстая бялізна. Праз малочную кухню яны атрымліваюць гарачыя снеданні, абеды. Іх даглядаюць няні і сёстры, якія з гонарам выконваюць даручаную ім справу.

Да 80 дзяцей праходзяць у суткі праз дзіцячы пакой. Цёплыя і клапатлівыя адносіны абслугоўваючага персанала робяць добрае ўражанне на мацярэй. За гэтыя клопаты работнікі пакоя атрымліваюць многа падзяк.

Жанчына ў старой дарэволюцыйнай Расіі з жахам чакала нараджэння дзіцяці, бо перад ёй стаяла пагроза беспрацоўя, нішчата, голад, сухоты. Для совецкай жанчыны нараджэнне дзіцяці—вялікая радасць. Партыя і ўрад клапоцяцца аб ёй і яе дзіцяці. Многадзетным мацерам выдаецца грашовая дапамога. Пабудаваны тысячы дзіцячых садоў, ясляў, пляцовак. Усім гэтым мы абавязаны нашаму роднаму дарагому бацьку і настаўніку таварышу Сталіну.

Паліна Сяргееўна Радзіонава.

Орша.

Карагандa

Караганда—адзін з багацейшых раёнаў нашай краіны. Ён размешчан у цэнтры хутка квітнеючай Казахскай ССР.

Геалагічная разведка нетраў Карагандзінскага вугальнага басейна далёка яшчэ не скончана, але матэрыялы, якія ўжо ёсць, даюць падставу меркаваць, што **Караганда па геалагічных запасах блізка падыходзіць да Данецкага басейна.**

Вугалі Караганды—адны з лепшых у свеце. Па мізэрнаму ўтрыманню прымесі і серы фосфара, яны ўпаўне прыгодны для металургіі. Кокс з іх атрымоўваецца цвёрды, шэры, звонкі, з невялікай зольнасцю, якая спякаецца пры высокай тэмпературы.

Сістэматычныя геолагаразведачныя работы былі пачаты ў 1928 годзе. Наяўнасць велізарных запасаў вугалю, іх зручнае заляганне, выгаднае геаграфічнае размяшчэнне басейна—усё гэта спрыяе ўмовам для хуткага росту новага прамысловага цэнтра. І 15 жніўня 1931 года ЦК нашай партыі пастанавіў, што „геаграфічнае размяшчэнне Карагандзінскага басейна, наяўнасць велізарных запасаў вугалю, іх каксуемасць, спрыяючы характар залягання вугалю патрабуе хутчэйшага стварэння на базе вугальных месцанараджэнняў Караганды трэцяй магутнай вугальнай базы СССР".

Карагандзінскі вугаль корміць не толькі прамысловасць Паўднёвага Казахстана і сярэднеазіяцкіх рэспублік. Карагандзінскі вугаль тысячамі тон накіроўваецца па ўноў пракладзенаму сталёваму шляху меднай прамысловасці—Балхашскаму медзеплавільнаму камбінату.

Паблізку паўночнага берагу возера Балхаш, у падножжа гары Коунрад і на самой гары нашымі геолагамі ў 1928 годзе былі выяўлены „зялёныя камні". Доследы паказалі, што гэта медная руда, і што ўся гара Коунрад складаецца з медзі. Коунрад—жамчужына маладога Казахстана—грандыёзнае месцанараджэнне медзі сусветнага значэння. І воляй большэвікоў, па ўказанню таварыша Сталіна, вырашана было пабудаваць на паўночным беразе Балхаша медны камбінат. Гэты камбінат будзе даваць нашай краіне штогод 100 тысяч тон медзі, што перавышае больш чым у 3 разы ўсю выплаўку медзі ў даваеннай Расіі. Такой буйнай штогодняй вытворчасці медзі не ведае ні адзін медзеплавільны завод Еўропы.

Карагандзінскі вугаль снабжае прамысловасць Акмалінска, Петрапаўлаўска і Паўднёвага Урала. Халілаўскі металургічна-хімічны камбінат, які будуецца к захаду ад Орска на багацейшых залежах руд—будзе амаль цалкам залежаць у сваёй энергетычна-коксавай базе ад Караганды.

Караганда ўжо сёння дае Магнітагорску дзесяткі тысяч тон каксуючагася вугалю. Адлегласць Магнітная—Караганда пры існуючай чыгуначнай сеці складае 1658 кілометраў, а пасля скончэння пабудовы спрамляючай лініі будзе не больш 1200 кілометраў, амаль удвая менш, чым Магнітная—Кузбас (2300 кілометраў).

Восем год назад на месцы Караганды стаялі адзінокія юрты вандроўных казахаў. Стандартныя дамы цяпер пачалі ўступаць месца вялікім каменным будовам.

У 1934 годзе пачаў будавацца новы горад, размешчаны кілометрах у сямі ад старога, на беразе возера. Тут цэлыя вуліцы з каменнымі трохпавярховымі дамамі, абсталяванымі вадаправодам і каналізацыяй. Толькі за апошнія тры гады на будаўніцтва жыллёвых дамоў, культурных і соцыяльна-бытавых устаноў тут выдаткавана звыш 55 мільёнаў рублёў. Архітэктары надаюць гораду прыгожы, сучасны выгляд, мастацкую законча-насць.

Новая Караганда будзе горадам, утапаючым у зелені. Ужо зараз яна ўпрыгожваецца зялёнымі насаджэннямі. Чатыры мільёны дрэваў і хмызнякоў—срабрысты топаль, амерыканскі клён, акацыя, ель, крыжоўнік, маліна і дзесяткі другіх—высаджаны на Карагандзе за апошнія тры гады. У цэнтры горада—вялікі сквер. Між горадам і пасёлкам Майкудук на 150 гектарах раскінуўся парк культуры і адпачынку. Водаснабжэнне ва ўмовах карагандзінскіх стэпаў—важнейшая задача. Большэвікамі пабудован вадаправод Нура-Караганда ў 30 кілометрах.

Караганда хутка расце і ўпрыгожваецца. У горадзе 18 дзіцячых ясляў, 7 кансультацый, многа школ і розных культурных устаноў: прыезджы адчувае сябе жыхаром бурна кіпучага, вялікага прамысловага цэнтра. На вуліцы сустракаюцца прафесары, геолагі, шахцёры, шумныя натоўпы вучняў.

Абяцанні гарнякоў Караганды правадыру народаў вялікаму Сталіну ў сувязі з 5-гадовым гістарычным рашэннем ЦК ВКП(б) аб будаўніцтве Караганды імі выконваецца. А яны абяцалі: „Мы ператворым Караганду ў горад вугалю, кокса, садоў, кветак—у адну з цвярдынь абароны нашай соцыялістычнай радзімы".

Б. Ліберман.

МЕРЫ БАРАЦЬБЫ З СВІРНАВЫМІ КЛЯШЧАМІ Ў ЗІМОВЫ ПЕРЫЯД

У мінулым годзе наша краіна атрымала шэсць з лішнім мільярдаў пудоў хлеба. Атрыманне такога вялікага ўраджаю паставіла перад народнай гаспадаркай вельмі адказную задачу—захаваць яго ад тых страт, якія прыносяць ёй свірнавыя кляшчы. Неабходна адзначыць, што яны прыносяць захоўваемаму зярну і прадуктам яго пераапрацоўкі велізарную страту, якую па БССР падлічваюць у некалькі мільёнаў рублёў. Таму барацьба за захаванне сабранага ўраджаю з'яўляецца справай вялікай дзяржаўнай важнасці. Аб гэтым указвалі не раз у сваіх рашэннях ЦК ВКП(б) і СНК СССР.

Свірнавыя кляшчы—дробныя жывыя істоты, якія адносяцца да класа павукападобных. З ліку апісаных у літаратуры відаў кляшчоў, там, дзе захоўваецца зярно і прадукты яго пераапрацоўкі, у БССР сустракаецца дзевяць відаў кляшчоў, якія прыносяць тую ці іншую шкоду.

Асабліва размнажаюцца кляшчы пры ўмове павышанай вільготнасці і тэмператур.

У 1938 годзе мною ў інстытуце біялогіі Акадэміі Навук БССР былі зроблены вопыты па ўплыву вільготнасці насення на развіццё кляшчоў.

У кожную пробу ільну змяшчалася па 100 штук мучных кляшчоў. Вопыты праводзіліся на працягу з 15 чэрвеня 1938 г. па 4 ліпеня 1938 года пры тэмпературы 19—25° С.

Пры падліку аказалася, што ў насенні ільну, якое мела 10 проц. вільготнасці, усе кляшчы загінулі, пры 12 проц. аказалася 114 штук (павелічэнне на 14 штук), пры 14 процантах—1197,16 проц.—1463, 18 проц.—2455 і пры 20 проц. вільготнасці 3473 штук кляшчоў. Такім чынам з павелічэннем процантаў вільготнасці павялічваецца і колькасць кляшчоў. Пры правядзенні вопытаў з насеннем жыта, пшаніцы, ячменю і аўсу поўнае знішчэнне кляшчоў наглядалася пры 12 проц. вільготнасці. Хуткае развіццё кляшчоў было пры вільготнасці насення ў 16—20 проц. Кляшчы прыносяць шкоду тым, што ў першую чаргу выядаюць зародак, ад чаго насенне вельмі зніжае ўсхожасць.

Акрамя таго, што кляшчы знішчаюць зародкі, яны таксама знішчаюць унутранае ядро зярна, забруджваюць збожжа і прадукты яго пераапрацоўкі, ад чаго траціцца іх каштоўнасць.

У барацьбе са свірнавымі кляшчамі першараднае значэнне маюць папераджальныя мерапрыемствы, як засыпка сухога, ачышчанага насення, ачыстка свірнаў, мяшкоў, збожжаачышчальных машын, токаў, малацілак ад кляшчоў і г. д.

Перад засыпкай насенне павінна абавязкова ачышчацца на збожжаачышчальных машынах ад сарнякоў і розных механічных прымесяў. Ачыстка яго павінна праводзіцца на адлегласці не менш 100 метраў ад свірна. Адыход, атрыманы ў часе ачысткі, павінен захоўвацца ў асобным памяшканні. Пры скарыстанні для корму жывёлы, яго перад кармленнем абліваюць кіпяткам.

Ні ў якім разе нельга пры засыпцы змешваць сухое насенне з вільготным, бо гэта ў далейшым прыводзіць да самасагравання і стварэння ўмоў для развіцця ў вялікай колькасці кляшчоў.

У часе захавання насення патрэбна сістэматычна праводзіць даследванне на заражанасць яго кляшчамі. Пры выяўленні заражанасці насення кляшчамі апошняе патрэбна ў сухое, халоднае надвор'е прапусціць праз збожжаачышчальныя машыны (веялкі і сартыроўкі) пры гэтым унутры насення будзе створана паніжаная тэмпература, пры якой кляшчы не змогуць размнажацца. Для знішчэння кляшчоў у насенных фондах можна прымяняць нафталін, або ачышчаную крэйду.

Нафталін можна ўжываць толькі для тых насенных фондаў, насенне якіх добра ачышчана, мае нармальны процант усхожасці і вільготнасць не вышэй для зернавых—14 проц., ільну—13 процантаў, бо адыходы і самае нафталізіраванае зярно нельга ўжываць у страву. На 1 тону насення неабходна браць 250—500 грамаў нафталіна. Спосаб ужывання наступны: нафталін расціраецца ў дробны парашок, якім апудрываецца насенне. Насенне, апудранае нафталінам, захоўваецца ў асобным памяшканні.

Акрамя нафталіна для барацьбы з кляшчамі можна прымяняць апудрыванне зярна крэйдай. Для гэтай мэты ўжываецца высокаякасная пылевідная (абмучаная) крэйда. Вільготную ў камках крэйду ўжываць для гэтага не рэкамендуецца. На 1 тону насення ўжываецца 3 кілограмы крэйды. Апрацоўваць можна толькі насеннае зярно, як авёс і ячмень. Што датычыцца насення пшаніцы, жыта і ільну, то іх апыльваць нельга, бо пасля гэтага парашкі пратручвальнікаў не будуць добра прыліпаць. Насенне, прызначанае для апудрывання крэйдай, павінна быць ачышчана і мець нармальную ўсхожасць і вільготнасць не звыш 14 проц.

Пры апудрыванні насення крэйдай ці нафталінам можна скарыстаць машыны, якія ўжываюцца для сухога пратручвання супроць галоўні.

У часе захавання насення ўнутры свірна неабходна ўдаляць ў кутках каля сцен засекаў пыл, які збіраецца, смяццё і павуцінне. Сабраны пыл, смяццё і павуцінне абавязкова патрэбна спальваць, а не выкідаць каля свірна, як гэта робяць некаторыя кладаўшчыкі.

У памяшканні, дзе захоўваецца насенне, нельга дапускаць захоўвання мукі, круп і іншых прадуктаў. Мяшкі таксама павінны захоўвацца ў асобым памяшканні, сістэматычна праглядацца і абеззаражвацца ад кляшчоў.

Толькі пры добраякасным правядзенні вышэй адзначаных мерапрыемстваў мы зможам захаваць насенне ад тых страт, якія прыносяць яму кожны год свірнавыя кляшчы.

А. Маркавец.
Кандыдат біялагічных навук.

БА 663

Адказны рэдактар Г. В. КАГАН.

Адрас рэдакцыі: Менск, Дом Працы, 3-ці паверх, пакой 8. Тэл. 24-058, 24-070.

Друкарня імя Сталіна. Зак. № 48. Тыраж 11.600 экз. Уп. Галоўліта БССР № 4550.
Здана ў друкарню 13/I—39 г. Падпісана да друку 25/I—39 г. У нумары 2½ арк. 120.140 друк. знакаў.

ЦАНА 20 кап.



Узор вышыўкі дзіцячага плацця.



Узор вышыўкі ручніка.



Узор вышыўкі мужчынскай рубашкі (малюнкі вышываюцца крэстом).